## Па тваіх, Ільіч, запаветах

# 6. Дастойная змена

### ◆ АБ ЧЫМ РАСКАЗАЛА КНІГА НАРОДНАЙ СЛАВЫ



Эстафету барацьбітоў 30-х гадоў за стварэнне і ўмацаванне калектыўнага грамадства прынялі нашчадкі, выхаваныя Камуністычнай партыяй у духу беззапаветнай любві і адданасці справе пабудовы сацыялістычнага грамадства, і змагаючыяся за ажыццяўленне планаў па стварэнню матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма. На кожным участку сельскагаспадарчай вытворчасці яны паказваюць прыклад, як трэба змагацца за вытворчасць вялікай прадукцыі сельскай гаспадаркі.

Сельская гаспадарка баханскіх калгасаў пасля выгнання нямецка-фашысцкіх захопнікаў мела варты жалю малюнак. Але дзякуючы працоўнаму энтузіязму калгаснікаў, велізарнай дапамозе Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, усіх брацкіх народаў Савецкага Саюза, і, ў першую чаргу, вялікага рускага народа, працаўнікі вёскі ў кароткі тэрмін залячылі раны вайны. Гэтаму садзейнічалі высокая арганізаванасць, вера ў свае сілы патомных хлебаробаў. Вялікую ролю ў аднаўленчых работах ў пасляваенны перыяд адыгралі кадры, выйшаўшыя з асяроддзя калгаснікаў. На адказных пастах, пры выкананні даручэнняў праўленняў калгасаў яны праяўлялі вялікую напорыстасць, знаходлівасць, прыкладалі шмат сілы і энергіі для таго, каб расла эканоміка сельгасарцелей, мацнелі гаспадаркі.

Вялікі ўклад ва ўмацаванне калектыўных гаспадарак зрабілі механізатары. Многія з іх у 16-гадовым ўзросце селі за штурвалы трактараў. Не даставала запчастак, тэхніка несвоечасова забяспечвалася гаруча-змазачнымі матэрыяламі. Амаль штодзень прыходзілася ім пераадольваць розныя цяжкасці, ў барацьбе з якімі загартоўваліся і сталелі кадры.

У большай частцы трактарыстаў працоўны шлях пачынаўся з прычэпшчыка. Зараз ва ўзбуйненым калгасе яны працуюць старшымі трактарыстамі, камбайнерамі, кіруюць складанымі, больш дасканалымі машынамі. Больш 22 гадоў водзяць машыны па калгаснай ніве трактарысты Якаў Яўменавіч Савасценка, Васіль Іванавіч Дзенісенка, камбайнер Мікалай Піменавіч Лагуценка. Больш дзесятка гадоў выконваў на трактары розныя сельскагаспадарчыя работы Васіль Іванавіч Старасценка, Іван Ігнатавіч Міхайленка і другія механізатары.

Тысячы гектараў глебы апрацавала трактарная брыгада калгаса «Чырвоны маяк», змагаючыся за павышэнне культуры земляробства, за збор высокай прадукцыі паляводства. Кіраваць брыгадай механізатараў даручана камуністу Міхаілу Іванавічу Старасценку, у якога 14-гадовы стаж работы з механізатарамі. Важак трактарыстаў з'яўляецца адным з тых, хто ў гады разрухі ў пасляваенныя гады ўзяў у рукі штурвал трактара «ХТЗ» і пачаў змагацца за хлеб.

Вырас і значна змяніўся машынна-трактарны парк калгаса. Цяпер тут у наяўнасці 9 трактараў, 9 аўтамашын, 5 зернявых камбайнаў, шмат прычапной і рухаючайся сельскагаспадарчай тэхнікі. Працуюць на ёй, у асноўным, механізатары шырокага профілю.

Дастатковая аснашчанасць гаспадаркі тэхнікай намнога аблегчыла працу хлебароба. Асноўныя работы, звязаныя з вырошчваннем вядучых сельскагаспадарчых культур, механізаваны тут на 100 працэнтаў.

Укараняецца механізацыя ў жывёлагадоўлі — асноўнай высокадаходнай галіне калгаса. Для грамадскай жывёлы тут пабудаваны добротныя памяшканні, статак папоўніўся пароднай жывёлай. Фермы сталі высокапрадуктыўнымі.

Многа працы ў развіццё грамадскай жывёлагадоўлі і росту яе прадуктыўнасці ўклалі ветэраны жывёлагадоўлі, цяпер пенсіянеркі, Кацярына Сямёнаўна Аўчыннікава, Ганна Якаўлеўна Антоненка і прадстаўніца маладзейшага пакалення Ніна Давыдаўна Сотнікава, якая працуючы на свінаферме ў мінулым годзе дабілася 590-грамавай прывагі кожнага адкормніка. Па 450 грамаў сярэднесутачнай прывагі кожнага адкормніка дабівалася яна на працягу сямі месяцаў гэтага года. У ліку перадавікоў жывёлагадоўлі свінарка Еўдакія Маркаўна Масейкава, даярка Ніна Кандрацьеўна Шэшкіна.

Вялікую ўвагу ў апошнія гады ў сельгасарцелі ўдзяляюць росту грамадскага статка, павелічэнню вытворчасці ўсёй сельскагаспадарчай прадукцыі, паляпшэнню яе якасці. Шчыльнасць жывёлы ў мінулым годзе ў сельгасарцелі складала па 20 галоў буйной рагатай жывёлы на кожныя 100 гектараў сельгасугоддзяў і па 27,6 галавы свіней на кожныя 100 гектараў ворыва. Вытварана малака па 159 цэнтнераў, мяса па 35 цэнтнераў. Прададзена дзяржаве адпаведна 3241 і 704 цэнтнеры прадуктаў жывёлагадоўлі. Гаспадарка рэалізавала прадукцыю высокай якасці.

У апошнія гады значна ўзрасла эканоміка калгаса. Грашовы даход у мінулым годзе тут склаў 306,7 тысячы рублёў.

З кожным годам багацее калгас. Паўней задавальняюцца патрэбы калгаснікаў, узрастае аплата працы хлебаробаў. У мінулым годзе яна ў сярэднім склала 3 рублі на чалавека-дзень.

Значна вырасла майстэрства паляводаў і спецыялістаў сельскай гаспадаркі, уменне правільна бачыць перспектывы развіцця, дакладна вызначаць галоўны рычаг уздыму вытворчасці. Рост майстэрства працаўнікоў калгаса быў неабходны і непазбежны ў ходзе развіцця калектыўнай гаспадаркі.

Добрасумленна працуюць у калгаснай вытворчасці паляводы Елізавета Яфімаўна і Марыя Пятроўна Карыткіны, жывёлаводы. За сем месяцаў гэтага года на фермах калгаса вытварана па 121 цэнтнеру малака на кожныя 100 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў і па 18,6 цэнтнера мяса ўсіх відаў.

За гады савецкай улады значна ўзрасла культура сельскіх працаўнікоў, матэрыяльны дабрабыт. На службу сельскім працаўнікам пастаўлена электрычнасць, электраматоры, якіх у калгасе каля 20.

Дзеці многіх патомных хлебаробаў атрымалі адпаведную адукацыю, вучацца і працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі. Больш 40 баханцоў атрымалі прафесіі настаўнікаў, у вышэйшых навучальных установах краіны працуюць два кандыдаты навук, больш трыццаці аднавяскоўцаў працуюць аграномамі, заатэхнікамі, ветэрынарнымі работнікамі. Выраслі тут медыкі і юрысты. Служаць у радах Савецкай Арміі афіцэры і радавыя салдаты.

З вялікім працоўным уздымам і радасным хваляваннем рыхтуюцца сустрэць векавы юбілей з дня нараджэння У. І. Леніна працаўнікі калгаса «Чырвоны маяк». Яны самаадданы змагаюцца за ажыццяўленне сацыялістычных абавязацельстваў, прынятых у гонар гэтай знамянальнай даты, за пераўтварэнне ў жыццё рашэнняў XXIII з'езда КПСС, планаў камуністычнага будаўніцтва. Свой адчувальны ўклад у агульнанародную справу ўносяць паслядоўнікі змагароў за савецкую ўладу. Эстафету бацькоў і дзядоў прыняла і з гонарам працягвае дастойная змена.

**І. Барысенка.**

**Барысенка, І.** Дастойная змена : аб чым расказвае кніга народнай славы / І. Барысенка // Шлях Кастрычніка.
*Сельская гаспадарка баханскіх калгасаў пасля выгнання нямецка-фашысцкіх захопнікаў.*